равана не менш чым 45 спецыяльных атрадаў і груп, у саставе якіх, па няпоўных падліках, было 540 чал. Яны паўплывалі на развіццё партызанскага руху на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці. Іх камандзіры ўзначалілі атрады і брыгады ў Баранавіцкай вобласці ці занялі іншыя пасады ў кіраўніцтве партызанскім рухам. Групы і атрады з савецкага тылу ўнеслі вялікі ўклад і ў станаўленне і развіццё дыверсійнай дзейнасці на той тэрыторыі. Яны сталі значнай часткай партызанскіх сіл некаторых зон у Баранавіцкай вобласці. Дастаткова сказаць, што Паўднёвае злучэнне Баранавіцкай вобласці амаль цалкам скпадалася з фарміраванняў, створаных на аснове груп і атрадаў, якія прыбылі з савецкага тылу ці ўсходніх раёнаў Беларусі.

Літаратура і крыніцы

1. *Боярский, В.И.* Партизаны и армия: История утерянных возможностей / В. И. Боярский. – Минск: Харвест, 2003. – 304 с.
2. *Валаханович, И.А.* Неизвестная война / И.А. Валаханович. // Бел. газета. – 2002. – 16 дек. – С. 29–30.
3. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны. В 3 т. / гл. ред. А.Т. Кузьмин – Минск: Беларусь, 1983 – Т. 1. – 591 с.
4. *Лесничий, С.* Далеко за фронтом / С. Лесничий – Минск: Беларусь, 1972. – 224 с.
5. *Липило, П.П.* КПБ-организатор и руководитель партизанского движения в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны / П.П. Липило – Минск: Госиздат БССР, 1959. – 259 с.
6. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): Краткие сведения об организационной структуре партизанских соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе. – Минск: Беларусь, 1983. – 765 с.
7. *Попов, А.Ю.* Диверсанты Сталина. Деятельность органов Госбезопасности СССР на оккупированной советской территории в годы Великой Отечественной войны / А.Ю. Попов. – http://militera.lib.ru/h/popov_au2/index.html
8. *Попов, А.Ю.* НКВД и партизанское движение / А.Ю. Попов. – М., Олма-Пресс, 2003. – 295 с.
9. *Шубин, Г.А.* Из истории всенародной борьбы против немецко-фашистских оккупантов в западных областях Белоруссии (июнь 1941 – июль 1944 г.) / Г.А. Шубин – Волгоград: Сов. писатель, 1972. – 312 с.
10. *Якубовский, Н.А.* В тыл врага (Помощь страны кадрами партизанскому движению Белоруссии в годы Великой Отечественной войны) / Н.А. Якубовский. – Минск: Беларусь, 1979. – 287 с.
11. НАРБ. – Ф. 4. – Воп. 33а. – Спр. 668.
12. НАРБ. – Ф. 4. – Воп. 33а. – Спр. 466.
13. НАРБ. – Ф. 4. – Воп. 33а. – Спр. 471.
14. НАРБ. – Ф. 3500. – Воп. 4. – Спр. 259.
15. НАРБ. – Ф. 3500. – Воп. 4. – Спр. 349.
16. НАРБ. – Ф. 3500. – Воп. 8. – Спр. 90.
17. НАРБ. – Ф. 3500. – Воп. 8. – Спр. 92.
18. НАРБ. – Ф. 3500. – Воп. 8. – Спр. 132.
19. НАРБ. – Ф. 3500. – Воп. 8. – Спр. 202.
20. НАРБ. – Ф. 3500. – Воп. 8. – Спр. 207.
21. НАРБ. – Ф. 3500. – Воп. 8. – Спр. 236.
22. НАРБ. – Ф. 3500. – Воп. 8. – Спр. 266.
23. НАРБ. – Ф. 3500. – Воп. 12. – Спр. 10.

Summary

*The article is devoted to the description of the role of the partisan detachments and groups specially prepared in the unoccupied Soviet territory in the starting and development of the partisan struggle in Baranavichi area. The author shows stages of their sending there and also makes a conclusion that the attempt of creating of the partisan movement in the territory of Baranavichi area in 1941 with the help of the formations from the Soviet rear wasn't successful. It's stressed although that in the following years especially beginning at the end of 1942 they had great influence on its further development.*

---

*УДК 973.092.9*

***І.В. Варывончык***

# СЯРЭДНІ КЛАС У ПАЛІТЫЦЫ АДМІНІСТРАЦЫІ Б. КЛІНТАНА

Выбарчая кампанія Б. Клінтана 1991 г. праходзіла пад лозунгамі абароны інтарэсаў сярэдняга класа. Абмяркоўвалася пытанне аб «двайным дэфіцыце» – дэфіцыце федэральнага бюджэту і дэфіцыце ўкладанняў у грамадскія інфраструктуры), які ўтварыўся ў выніку «халоднай вайны», і 12 гадоў праўлення ігнараваўшых гэту праблему рэспубліканцаў. Кандыдаты ў прэзідэнты і віцэ-прэзідэнты Б. Клінтан і А. Гор добра ведалі тых, да каго яны звярталіся. Юнацкія гады Клінтана прайшлі ў прыгарадзе горада Хот Спрынгз у Арканзасе. Юнацтва Гора прайшло ў невялікім гарадке Карфаген у Тэнесі і прыгарадзе Вашынгтона, дзе ён вучыўся ў мясцовай прэстыжнай школе. З прыгарадных сем'яў былі і іх жонкі. Добраму веданню прыгараднага жыцця, інтарэсаў і патрэб сярэдняга класа спрыялі гады іх вучобы ў вышэйшых навучальных установах [4, с. 28–37]. У праграмных заявах Б. Клінтан і А. Гор абяцалі павелічэнне ўкладанняў у грамадскую інфраструктуру, адукацыю, у «чалавечы капітал». Зніжэнне і ліквідацыя дэфіцыту дзяржаўнага бюджэту не павінны былі адлюстравацца на сацыяльна значных праграмах урада. Эканамічны рост планавался спалучаць з памяншэннем розніцы ў даходах багатых і бед-

ных, багатыя павінны былі плаціць «справядлівую частку падаткаў» [7, с. 6–9]. Рыторыка Клінтана сустракала адабрэнне і падтрымку сярэдняга класа, яго звароты да «сацыяльнай адказнасці» і салідарнасці ўсіх грамадзян у многім нагадвала заклік Дж. Кенэдзі, з чыёй фігурай і палітыкай Клінтан сябе пастаянна асацыіраваў. Клінтан зрабіў спробу адрадзіць шырокую кааліцыю прыхільнікаў Дэмакратычнай партыі, каб пераадолець праблемы, якія раздзялялі дэмакратычны электарат з канца 60-х гг., па пытаннях аб становішчы нацыянальных меншасцей, абароне маламаёмных, аб маральных каштоўнасцях.

Рэалізацыі дадзеных сярэдняму класу абяцанняў перашкодзілі аб'ектыўныя сацыяльна-эканамічныя цяжкасці і яўныя палітычныя пралікі прэзідэнта. У 1993 г. беспрацоўе складала 7,2%, працягваў расці дэфіцыт знешняга гандлю і дзяржаўны доўг. З мэтай агульнага аздараўлення эканомікі асноўную ўвагу было вырашана надаць пытанню аб дэфіцыце дзяржаўнага бюджэту. Прапанаваны ў лютым 1993 г. Кангрэсу эканамічны план прадугледжваў павелічэнне падаткаў не толькі на карпарацыі, 10% рост падаткаў на грамадзян з гадавым даходам больш за 250 тыс. долараў, але і павелічэнне падаткавага цяжару для сярэдняга класа пры аднначасовым зніжэнні ўкладанняў у грамадскія інфраструктуры, навучанне і перападрыхтоўку кадраў на 1%. Факт тым больш цікавы, калі ўзяць пад увагу тое, што апошні бюджэт рэспубліканцаў утрымліваў павелічэнне аналагічных расходаў на 9%. Абяцаныя падчас выбарчай кампаніі ўкладанні ў грамадкія інфраструктуры, у «чалавечы капітал», на стварэнне новых рабочых месц (50 млрд у год) былі забыты, а ўрэзаны пакет прапаноў коштам 30 млрд долараў не атрымаў падтрымкі Кангрэса [2, с. 72–74]. Свае дзеянні адміністрацыя тлумачыла неабходнасцю агульных ахвяр для ліквідацыі вынікаў праўлення рэспубліканцаў.

Нягледзячы на абмежаваны і кампрамісны характар прынятых рашэнняў у Клінтана і яго адміністрацыі меліся магчымасці не толькі захаваць, але і расшырыць падтрымку сярэдняга класа ў выпадку поспеху прапанаванай імі рэформы сістэмы медыцынскага страхавання. Гэтага не адбылося.

Праект рэформы распрацоўваўся пад кіраўніцтвам Хілары Клінтан, у выніку чаго з працэсу распрацоўкі былі выключаны не толькі Кангрэс і зацікаўленыя лабісцкія групы, якія стаялі за ім, але і прэзідэнцкая адміністрацыя.

Прадстаўлены прэзідэнтам у верасні 1993 г. у Кангрэсе праект рэформы першапачаткова атрымаў адабрэнне грамадскасці. Колькасць тых, хто падтрымліваў рэформу, перавышала колькасць яе праціўнікаў на 32%. У сакавіку 1994 г. гэты паказчык складаў 18%, к снежню колькасць праціўнікаў рэформы перавысіла колькасць прыхільнікаў [3, с. 518–520]. Прычыны паражэння зводзіліся, па-першае, да моцнага супраціўлення рэспубліканцаў у Кангрэсе, якія выступілі адзіным фронтам з лабісцкімі групамі, што прадстаўлялі інтарэсы прыватных страхавых кампаній, зацікаўленага дробнага і сярэдняга бізнесу. Рэспубліканцы добра разумелі, якія палітычныя выгады магло прынесці дэмакратам рашэнне такога важнага для кожнага амерыканца пытання. «Это их Стапинград, их Геттесберг, их Ватерлоо», – падкрэсліваў лідэр правых рэспубліканцаў, член Палаты прадстаўнікоў з Джорджыі Н. Гінгрыч. Дэмакраты былі абвінавачаны ў спробе стварэння новай, груваcткай, дзяржаўнай, а таму неэфектыўнай бюракратычнай і дарагой структуры.

Па-другое, мелі месца яўныя стратэгічныя пралікі, што, як адзначалася, выразілася ў келейным спосабе распрацоўкі закранаўшых многія інтарэсы рашэнняў і зацягванні з прадстаўленнем у Кангрэс канкрэтнага законапраекта.

Па-трэцяе, па шэрагу іншых менш значных пытанняў прэзідэнт быў вымушаны прымаць кампрамісныя рашэнні, што вяло да падзення яго аўтарытэту. Яўным тактычным пралікам прэзідэнта стала спроба ў якасці першай сваёй ініцыятывы рэалізаваць перадвыбарнае абяцанне гарантаваць правы гомасексуалістаў у арміі. Ратыфікацыя дагавора аб Свабоднай зоне паўночнаамерыканскага гандлю патрабавала кампрамісаў у пытаннях бюджэтнай палітыкі і адмовы ад абяцаных капіталаўкладанняў у сацыяльныя інфраструктуры. Дадзеныя рашэнні не выклікалі асобага энтузіязму ў большасці прадстаўнікоў сярэдняга класа, якія не былі ўпэўнены ў карысці свабоднага гандлю з Мексікай і Канадай для ўласнага дабрабыту і тым больш не падтрымлівалі ідэю легалізацыі гомасексуалізму ў арміі.

Асноўную ролю адыгралі, аднак, абставіны, якія не мелі ніякіх адносін ні да медыцынскага страхавання, ні да іншых актуальных сацыяльна-эканамічных пытанняў. Аўтарытэт прэзідэнта, давер да яго ініцыятыў былі падарваны кампаніяй выкрыццяў скандальнага характару, якія разгарнуліся з канца 1993 г. і датычыліся асабістага жыцця прэзідэнта, злоўжыванняў уладай у карыслівых інтарэсах у бытнасць губернатарам Арканзаса, самазабойства былога партнёра жонкі прэзідэнта ў юрыдычнай фірме, сябра і саветніка прэзідэнта У. Фостэра. Абвінавачванні ў адрас прэзідэнта засталіся недаказанымі, але вынікам стала паражэнне дэмакратаў у барацьбе за рэформу медыцынскага страхавання і страта даверу сярэдняга класа.

Расчараванне выбаршчыкаў адлюстравалася на выніках выбараў у Кангрэс 1994 г. Група правых рэспубліканцаў на чале з Н. Гінгрычам прапанавалі выбаршчыкам праграмны дакумент «Контракт с Америкой». Пад сцягам барацьбы за лібералізацыю эканомікі, ліквідацыю дэфіцыту дзяржаўнага бюджэту і адраджэнне традыцыйных амерыканскіх каштоўнасцей планавалася рэзка абмежаваць ступень уплыву дзяржавы на эканоміку краіны, скараціць сацыяльныя расходы і знізіць падаткі перш за ўсё на багатых амерыканцаў [8–10].

Нягледзячы на папулізм і адсутнасць сур'ёзнага абгрунтавання прапанаванага курсу, паражэнне дэмакратаў было сакрушальным. Рэспубліканцы заваявалі 9 новых месц у Сенаце і 52 у Палаце прадстаўнікоў і атрымалі большасць у абедзвюх палатах Кангрэса, павялічылі сваё прадстаўніцтва ў легіслатурах штатаў, вырасла колькасць губернатаў-рэспубліканцаў. З 50 губернатараў 30 былі рэспубліканцамі і 11 з іх былі выбраны ў 1994 г. Аднак у выбарах прынялі ўдзел толькі 32% выбаршчыкаў. Большасць амерыканцаў, як паказалі больш позні сацыялагічныя даследаванні, ніколі не чулі аб праграмным дакуменце рэспубліканцаў «Контракте с Америкой» [11]. Мелі месца расчараванне і дэмабілізацыя дэмакратычнага электарата.

Выкананне перадвыбарных абяцанняў рэспубліканскай большасцю магло азначаць дэмантаж скпаданага механізму сацыяльна-эканамічнага рэгулявання, які стварыўся пачынаючы з «новага курсу» Рузвельта. Небяспекі такога кроку дастаткова хутка былі ўсвядомлены не толькі выбаршчыкамі, але і памяркоўнымі рэспубліканцамі, якія разумелі, што дэмантаж такіх скпаданых сістэм мог мець непрадказальныя вынікі і не існавала ніякіх гарантый, што новая, заснаваная на ідэалагізаваных прынцыпах «Контракта с Америкой» сістэма будзе працаздольная. Палова выбраных у Кангрэс рэспубліканцаў былі выбраны ўпершыню. Прыняцце з іх дапамогай законаў без абмеркавання Н. Гінгрычам і яго прыхільнікамі сустрэла супраціўленне лідэра Сената рэспубліканца Р. Доўла. К верасню 1995 г. 58% амерыканцаў не адабралі дзейнасць Кангрэса [3, с. 522].

Дэмакратычная меншасць у Кангрэсе і прэзідэнт занялі пазіцыю абаронцаў інтарэсаў сярэдняга класа і атрымлівалі падтрымку выбаршчыкаў. Яны выступілі супраць прапаноў скараціць расходы на адукацыю, перадаць у распараджэнне штатаў рашэнне пытанняў дзіцячага харчавання, супраць перагляду заканадаўства аб абароне навакольнага асяроддзя. Прэзідэнт жорстка раскрытыкаваў прапанаванае рэспубліканцамі скарачэнне за пяць гадоў на 270 млрд доларaў расходаў на медыцынскае абслуго ванне пенсіянераў. Аб неабходнасці рэфарма вання дарагой сістэмы сацыяльнага забеспячэн ня неаднаразова гаварыў і сам прэзідэнт. Але дадзеным выпадку ён звяртаў увагу выбаршчь каў на тое, што адначасова са скарачэннем рас ходаў на пенсіянераў практычна на тую ж сум прапаноўвалася памяншэнне падаткаў на бага тых амерыканцаў, што кансерватыўная рэвалю цыя рэспубліканцаў – гэта ні што іншае, як но вая спроба зрабіць багатых больш багатымі і ра шыць праблемы за кошт сярэдняга класа.

Вясной 1995 г. прэзідэнт сфармуляваў свой новы зварот да сярэдняга класа ў выглядзе ідэ «дынамічнага цэнтра», які, як ён сцвярджаў, «не в середине между левыми и правыми, а над ними». У аснове стратэгіі «дынамічнага цэнтра» ляжалі прапановы больш сціплай, але не менш шчодрай дзяржавы, арыентаванай на рашэнне сацыяльных пытанняў у рамках бездэфіцытнага бюджэту, дэцэнтралізацыя прыняцця рашэнняў і рынaчнае рэгуляванне, падтрымка тых, хто разлічваў толькі на сябе, а не на сацыяльную дабрачыннасць работнікаў. У якасці праграмнага дакумента грамадскасці 15 снежня 1994 г. быў прапанаваны дастаткова сціплы па сваім змесце «Билль о правах среднего класса», які прадугледжваў вылікі з падаткаў на даходы сум, затрачаных на атрыманне вышэйшай адукацыі да 10 тыс. дол., зніжэнне падаткаў на 500 дол. на кожнае дзіця для сем'яў з даходам менш чым 75 тыс. дол., рэарганізацыю 70 федэральных праграм прафесійнай падрыхтоўкі, якія дзейнічалі раней [5].

Сапернікам Б. Клінтана на выбарах стаў сенатар Р. Доўл. Ён быў ветэранам Другой сусветнай вайны, меў бездакорную рэпутацыю. Па выніках сацыялагічных даследаванняў, менавіта да яго адчувалі давер 65% амерыканцаў, у той час як асоба прэзідэнта выклікала давер толькі ў 45% [3, с. 526]. Аднак ён быў самым старым кандыдатам у прэзідэнты, яго выбранне ўяўлялася крокам назад у палітычным жыцці краіны. Намінацыя Доўла ад Рэспубліканскай партыі стала магчымай дзякуючы падтрымцы Хрысціянскай кааліцыі, правых рэспубліканцаў у Кангрэсе, іншых кансерватыўных сіл, што вымушала кандыдата падтрымліваць іх пазіцыю па пытаннях аб «сямейных каштоўнасцях», аб абортах, ролі жанчыны ў грамадстве [3, с. 526]. Дэмакраты зрабілі ўсё магчымае, каб уявіць Доўла ў якасці марыянеткі губляўшага папулярнасць лідэра рэспубліканскай большасці ў Палаце прадстаўнікоў Н. Гінгрыча.

Рашаючае значэнне для перавыбрання Б. Клінтана на другі тэрмін адыграла не занятая ім і Дэмакратычнай партыяй пазіцыя абароны сацыяльных праграм ці новы зварот да сярэдня-

га класа. Гэта дапамагло нейтралізаваць уплыў рэспубліканцаў. Галоўную ролю, як паказалі наступныя сацыялагічныя даследаванні, адыграў эканамічны пад'ём, які пачаўся з 1994 г. [1, с. 1349–1363].

Пасля паражэння ў барацьбе за рэформу медыцынскага страхавання і перамогі рэспубліканцаў на выбарах у Кангрэс Клінтан і яго адміністрацыя пры захаванні ранейшай рыторыкі не ставілі і не рабілі спроб змяніць палітычны ландшафт шляхам аб'яднання электарата вакол Дэмакратычнай партыі для рашэння значных сацыяльных пытанняў. Адміністрацыя пазіцыяніравала сябе як трэцяя сіла, якая супрацьстаіць стараму лібералізму і праваму экстрэмізму рэспубліканскага Кангрэса.

На працягу другога тэрміну прэзідэнцтва былі прыняты кампрамісныя рашэнні, якія задавальнялі і ліберальную і кансерватыўную частку палітычнай эліты краіны. Рэспубліканцы дабіліся зніжэння падатку на даходы з капіталу з 28 да 18%, зніжэння падатку на спадчыну, падаткавага крэдыту на адукацыю для ўсіх сем'яў з даходам да 110 тыс. дол. у год. Дэмакраты адносілі да сваіх заслуг зніжэнне падаткаў на сем'і з малым і сярэднім даходам, прадастаўленне медыцынскай страхоўкі палове дзяцей з сем'яў, не меўшых медыцынскай страхоўкі, і расшырэнне крэдыту на атрыманне вышэйшай адукацыі, які маглі атрымліваць сем'і з нізкімі даходамі [3, с. 534].

Вопыт праўлення дзвюх адміністрацый Б. Клінтана, па сутнасці, быў спробай рэалізацыі ў амерыканскіх умовах палітычнага курсу, які атрымаў назву «трэцяга шляху», найбольш яркімі прыкладамі якога ў Еўропе стаў «новы лейбарызм» Т. Блэра ў Вялікабрытаніі. Вынікі дадзенай палітыкі былі менш значнымі, чым у Еўропе. На гэта былі свае прычыны.

Акрамя палітычных памылак пры правядзенні выбранага палітычнага курсу, прызнаных самім Клінтанам, і адмоўнага ўплыву акалічнасцей, звязаных з асобай прэзідэнта, трэба выдзеліць аб'ектыўныя перашкоды, якія не дазвалялі рашаць стратэгічныя задачы першапачаткова прагрэсіўнай палітыкі, кардынальна папепшыць становішча сярэдняга класа. Па-першае, як ужо адзначалася, асаблівасцю амерыканскай сістэмы сацыяльнай абароны сярэдняга класа з'яўляецца яе пераважна прыватны, а не дзяржаўны характар, бо яна складаецца з рознага роду бенефіцый, прадастаўляемых работадаўцам у выглядзе карпаратыўных медыцынскіх страховак, дадатковых пенсій, бонусаў, іншых агавораных працоўнымі дагаворамі выплат. Гэтыя бенефіцыі часта датуюцца дзяржавай праз падаткавую сістэму. Уплываць на такую сістэму, спрабаваць замяніць яе на іншую ці зрабіць яе прадметам шырокага грамадскага абмеркавання, аб'ядналь намаганні сярэдняга класа з беднымі слаямі, якія не мелі доступу да даступных сярэдняму класу даброт, было невыканальнай задачай.

Па-другое, аналагічныя падставы меліся для няўдачных спроб адміністрацыі паўплываць на становішча на рынку працы. Сістэма дзяржаўнага працаўладкавання заставалася слаба неразвітой і арыентаванай на работу з некваліфікаванай рабочай сілай. Дамінуючую ропю на гэтым полі адыгрывалі прыватныя бюро па працаўладкаванні. Падтрымку грамадскасці мелі ідэі павышэння кваліфікацыі работнікаў, іх перападрыхтоўкі. Але рэальны эфект фінансаваных з федэральнага бюджэту праграм перападрыхтоўкі рабочай сілы заставаўся нязначным з прычыны адсутнасці механізмаў узаемадзеяння з прыватным бізнесам.

Па-трэцяе, адной з найбольш прывабных частак праграмы Клінтана было спрашчэнне доступу да адукацыі і павышэнне яе якасці. Асаблівасцю амерыканскай сістэмы адукацыі было, аднак, тое, што штаты, а не федэральны цэнтр на практыцы адыгрывалі вядучую ролю ў яе фінансаванні. Дабіцца рэальных вынікаў і адпаведных палітычных дывідэнтаў было цяжка.

Акрамя інстытуцыянальных меліся палітычныя асаблівасці, якія адрознівалі сітуацыю ў ЗША ад іншых краін, дзе рабіліся больш паспяховыя спробы правядзення палітыкі «трэцяга шляху». Да іх адносіліся магутны лабізм, абмежаваныя магчымасці прэзідэнта ўплываць на бюджэтны працэс, адсутнасць цвёрдай партыйнай дысцыпліны.

Мабілізацыя прыхільнікаў прагрэсіўнага курсу была ўскладнена адсутнасцю ці дэградацыяй неабходных арганізацыйных структур у выглядзе партыйных арганізацый ці прафсаюзаў і іх замяшчэннем апалітычнай масай выбаршчыкаў, вядучую ролю ў фарміраванні думкі якіх адыгрывалі сродкі масавай інфармацыі. Палітыка ўсё больш набывала віртуальны характар. Мэтай палітыкі станавілася не стварэнне і мабілізацыя дэмакратычнай большасці, а прыцягненне не свой бок няўстойлівага электарата.

Два перыяды знаходжання ва ўладзе былі палітычна паспяховымі. Клінтан і яго адміністрацыя змаглі пераадолець крызісныя моманты, звязаныя з перамогамі рэспубліканцаў у Кангрэсе ў 1994–1995 гг. і працэдурай імпічменту ў 1998–1999 гг. У штогадовым пасланні Кангрэсу ў студзені 1999 г. Б. Клінтан канстатаваў ліквідацыю дэфіцыту дзяржаўнага бюджэту, «наиболее продолжительный в мирное время период экономического роста, создание почти 18 миллиона рабочих мест, рост заработной платы, почти в два раза превышающий инфляцию, сок-

ращение количества американцев, живущих на социальные пособия до наиболее низкого уровня за последние 30 лет и самый низкий уровень безработицы, начиная с 1957 г.» [6, с. А22–А23]. Прэзідэнт планаваў накіраць даходы дзяржаўнага бюджэту на падтрымку пенсіянераў, умацаванне сацыяльнага забеспячэння і паляпшэнне медыцынскага абслугоўвання, на перападрыхтоўку кадраў і навучанне падрастаўшага пакалення.

У параўнанні з праграмнымі заявамі 1991–1992 гг. адсутнічалі згадкі аб «забытым сярэднім класе». Працяглы эканамічны рост змякчыў, але не рашыў стаяўшыя перад амерыканскім грамадствам пытанні. Палітыка наступнай рэспубліканскай адміністрацыі звядзе на нішто станоўчыя вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця другой паловы 90-х гг. XX ст.

Літаратура

1. *Alvarez, R., Nagler, J.* // American Journal of Political Science. – 1998. – № 4. – P. 1349–1363.
2. *Beatty, J.* Who Speaks for the Middle Class? / J. Beatty // Atlantic Monthly. – 1994. – Vol. 273. – № 5. – P. 65-78.
3. *Chafe, W. H.* The Unfinished Journey. America since World War II / W. H. Chafe. – New York: Oxford University Press, 1999.
4. *Clapson, M.* Suburbia and Party Politics / M. Clapson // Political Influence. – 2001. – № 9. – P. 28–37.
5. President Clinton Proposed a Middle Class Bill of Rights. – White House Documents. – Mode of access; <http://clinton1.nara.gov/White_House/Publications/html/briefs/ii-4.html> – Date of access: 22.02. 1998
6. *Clinton, B.* The Text of the President's State of the Union Address to Congress / B. Clinton // New York Times. – 1999. – January 20. – P. A22–A23.
7. *Clinton, B., Gore, A.* Putting People First / B. Clinton, A. Gore. – New York: Times Books, 1992.
8. *Gingrich, N.* Contract with America: the Boid pian by Rep. Newt Gingrich, Rep. Dick Armey and the House Republicans to change the nation / edited by Ed Gillespie and Bob Schellhas. – New York: Times Books, 1994.
9. *Gingrich, N.* Window of Opportunity: The Blueprint for the Future / N. Gingrich. – New York: Tom Doggerty Associates and St. Martin's Press, 1984.
10. *Gingrich, N.* To Renew America / N. Gingrich. – New York: Harper Collins, 1995.
11. *Norton, M., Katzman, D., Escott, P., Chudacoff, H., Paterson, Th., Tuttle, W.* A People and a Nation. A History of the United States / M. Norton, D. Katzman, P. Escott, H. Chudacoff, Th. Paterson, W. Tuttle. – Boston: Houghton Company, 1999.

Summary

*The article deals with approaches taken by Clinton's administration towards middle class Americans. The author analyzes ideology, substance, results and failures of the persuaed policy. He insists that the outcome depended both on the Clinton's policy itself and on institutional, political and economic circumstances, that determined limited character of final achievements.*

*УДК 973.092.9 "1992/1995"*

**В.В. Старычонак**

# АДМІНІСТРАЦЫЯ Б. КЛІНТАНА, КАНГРЭС, ГРАМАДСКАЯ ДУМКА І ЎДЗЕЛ ЗША ВА ЎРЭГУЛЯВАННІ БАСНІЙСКАГА КРЫЗІСУ (1992–1995 гг.)

Даследаванне знешняй палітыкі Злучаных Штатаў пасля заканчэння халоднай вайны было аб'ектам пільнай увагі гісторыкаў, палітолагаў, сацыёлагаў і іншых спецыялістаў. Значную цікавасць выклікалі пытанні аб мэтах, якія ставіла перад сабой адміністрацыя Б. Клінтана, калі прымала актыўны ўдзел ва ўрэгуляванні баснійскага крызісу, аб узаемаўплыве грамадскай думкі і кіраўніцтва краіны ў выглядзе выканальніцкай і заканадаўчай улад адносна гэтай праблемы. Вядомыя расійскія амерыканісты (В.А. Крамянюк, В.В. Шаклеін, Т.А. Шакпеіна і інш.) у сваіх даследаваннях прыходзяць да высновы, што часткай стратэгіі адміністрацыі Б. Клінтана з'яўлялася імкненне канчаткова ўстанавіць сусветнае лідэрства ЗША [4, с. 5–17]. В. В. Шаклеін, мяркуе, што ЗША здолелі здзейсніць шэраг мер, якія закранулі сістэму міжнароднай бяспекі: дабіцца пашырэння НАТА, аформіць сумесную стратэгію НАТА з глабальнымі інтарэсамі ЗША, замацаваць ваенна-сілавую мадэль урэгулявання канфліктаў, захаваць права ЗША на асабістае прыняцце рашэнняў з дыстанцыраваннем як ад ААН, так і ад НАТА [5, с. 160]. У артыкуле на прыкладзе палітыкі ЗША ў адносінах да ўрэгулявання баснійскага канфлікту зроблена спроба разгледзець, ці здолела адміністрацыя Б. Клінтана рэалізаваць адпаведную стратэгію. Асобая ўвага таксама будзе нададзена пункту гледжання амерыканскай грамадскасці і пазіцыі Кангрэса па гэтым пытанні.

Напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 1992 г. кандыдат у прэзідэнты Б. Клінтан рэзка раскрытыкаваў адміністрацыю Дж. Буша за марудную і нерашучую палітыку ў адносінах да Югаславіі, асабліва Босніі, прапануючы сілавое ўдзе-